# Запатрабаваныя будучыняй

25 студэнтаў пачнуць вучыцца па новай спецыяльнасці "Прамысловыя робаты і робататэхнічныя комплексы" з атрыманнем кваліфікацыі "інжынер-электрамеханік".

Студэнты будуць вывучаць дысцыпліны некалькіх комплексаў: інфармацыйныя тэхналогіі, тэхналогіі абсталявання прамысловых робатаў, канструяванне і аўтаматызаванае праектаванне, электратэхніка і электроніка, тэарэтычная і прыкладная механіка.

Выпускнікі авалодаюць навыкамі распрацоўкі і эксплуатацыі прамысловых робатаў і робатызаваных комплексаў, будуць ведаць абсталяванне з лічбавым праграмным кіраваннем, механічныя і электрамеханічныя сістэмы. Яны будуць добра падкаваны ў галіне інфармацыйных тэхналогій, тэорыі аўтаматычнага кіравання, аўтаматызаванага праграмавання, электронікі і схематэхнікі, тэарэтычнай і прыкладной механікі, мехатронікі.

— Фізтэх — самы навукаёмісты факультэт ва ўніверсітэце, — гаворыць дэкан фізіка-тэхнічнага факультэта Андрэй Герман. — Студэнты з першага курса маюць магчымасць займацца даследаваннямі, удзельнічаць у рабоце канструктарскага бюро "Практычная электроніка", студэнцкіх навукова-даследчых лабараторый "Камп'ютарнае мадэляванне фізічных працэсаў" і "Нанафатоніка". У 2019 годзе заключаны дагавор аб супрацоўніцтве з рэзідэнтам Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парка — асацыяцыяй "Робататэхніка і штучны інтэлект", што прадугледжвае сумесную адукацыйную дзейнасць па падрыхтоўцы спецыялістаў.

Для паступлення на гэтую спецыяльнасць трэба здаць цэнтралізаванае тэсціраванне па беларускай ці рускай мове, матэматыцы і фізіцы. Тэрмін навучання — 4 гады.

## "Дызайн віртуальнага асяроддзя"

На факультэце мастацтваў і дызайну ГрДУ адкрываецца новая спецыяльнасць "Дызайн віртуальнага асяроддзя" з атрыманнем кваліфікацыі "дызайнер".

Аб'ектам прафесійнай дзейнасці будучых спецыялістаў з'яўляецца віртуальнае асяроддзе і яго асобныя кампаненты: вэб-сайты, мультымедыйныя прэзентацыі, камп'ютарныя гульні, аніміраваныя відэаролікі, камп'ютарныя спецэфекты, графічныя карыстальніцкія інтэрфейсы і інш.

— Нягледзячы на тое, што раней мы не рыхтавалі спецыялістаў гэтага профілю, многія выпускнікі нашага ўніверсітэта працуюць у сферы вэб-, гейм-дызайну, — адзначыў загадчык кафедры дызайну Антон Ляшчынскі. — Вывучыўшы запатрабаванасць новага кірунку падрыхтоўкі спецыялістаў, мы атрымалі зацікаўленыя водгукі ад прадпрыемстваў і арганізацый і пераканаліся ў правільнасці нашага рашэння. Такіх спецыялістаў вельмі чакаюць, у тым ліку ў музеях, якія маюць патрэбу ў стварэнні віртуальных экскурсій. Пра рэкламу, прасоўванне прадукцыі з дапамогай сучасных сайтаў і казаць не прыходзіцца. Можна не сумнявацца, што выпускнікі новай спецыяльнасці з лёгкасцю знойдуць сваё месца ў жыцці.

Дызайнеры віртуальнага асяроддзя змогуць прымяніць атрыманыя веды ў мастацка-тэхналагічнай, вытворча-тэхналагічнай, арганізацыйна-кіраўнічай і навукова-даследчай дзейнасці, у галіне распрацовак друкаванай, знешняй і тэлевізійнай рэкламы, графічнага афармлення інтэрнэт-сайтаў, мультымедыйных дадаткаў і анімацыйных заставак для тэлевізійных праграм, віртуальных экскурсій, падручнікаў, анімацыйных мастацкіх і навучальных фільмаў і змогуць займаць пасады мастака-канструктара, дызайнера, UX/UI-дызайнера, вэб-дызайнера, гейм-дызайнера, дызайнера-ілюстратара, мастака-дызайнера камп'ютарнай графікі, дызайнера-візуалізатара.

Для паступлення на гэтую спецыяльнасць неабходна здаць цэнтралізаванае тэсціраванне па беларускай ці рускай мове, гісторыі Беларусі, а таксама прайсці творчы экзамен (малюнак). Тэрмін навучання — 5 гадоў на дзённай форме.

## "Спартыўна-педагагічная дзейнасць"

А вось каб паступіць на новую спецыяльнасць "Спартыўна-педагагічная дзейнасць (трэнерская работа)" на факультэт фізічнай культуры, трэба пацвердзіць свае веды на цэнтралізаваным тэсціраванні па беларускай ці рускай мове, біялогіі, а таксама прадэманстраваць фізічную падрыхтоўку. Выпускнікі атрымаюць кваліфікацыю "трэнер (па відзе спорту); выкладчык фізічнай культуры і спорту".

Асноўныя сферы прафесійнай дзейнасці будучых спецыялістаў — галіна фізічнай культуры і спорту, арганізацыя адпачынку, адукацыі, навуковыя даследаванні і распрацоўкі.

Тэрмін навучання — 4 гады на дзённай форме.

## Дыстанцыйна і якасна

Па чатырох спецыяльнасцях: "Пачатковая адукацыя", "Дашкольная адукацыя", "Турызм і гасціннасць", "Транспартная лагістыка (аўтамабільны транспарт)" — будзе весціся навучанне па завочнай (дыстанцыйнай) скарочанай форме.

— Такая форма дазваляе студэнтам быць у пастаянным кантакце з выкладчыкамі, а выкладчыкі атрымліваюць магчымасць бачыць, як працуюць студэнты на працягу семестра, — расказвае дэкан факультэта даўніверсітэцкай падрыхтоўкі адказны сакратар прыёмнай камісіі ГрДУ імя Янкі Купалы Ірына Карлюкова. — За кожным студэнтам замацаваны куратар і выкладчык па дысцыпліне. Калі раней сесіі праходзілі два разы ў год і доўжыліся тры тыдні, то пры завочнай дыстанцыйнай форме яны таксама будуць двойчы на год, але іх працягласць зменшыцца да 6—7 дзён. Упор робіцца на сістэмную працу, што дазволіць бачыць, як студэнты валодаюць ведамі і кампетэнцыямі, і павышаць узровень гэтых ведаў і кампетэнцый.

Паступаць на завочную (дыстанцыйную) форму навучання могуць абітурыенты, якія скончылі каледжы і маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю.

Сёлета на факультэце эканомікі і кіравання ГрДУ імя Янкі Купалы аднаўляецца набор на спецыяльнасць "Сусветная эканоміка" са спецыялізацыяй "Кіраванне знешнеэканамічнай дзейнасцю". Тут праводзіцца электроннае залічэнне абітурыентаў. Гэта магчыма дзякуючы сэрвісу "Лічбавы ўніверсітэт +", які накіраваны на лічбавізацыю працэсаў ва ўстанове.

**Надзея ВАШКЕЛЕВІЧ.**
*grodna@nastgaz.by*